Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЛЮТАГА 2020 г. ЧАЦВЕР № 24 (29138)

ШТО ЧАКАЕ ПАКІНУТЫХ У РАДЗІЛЬНІ МАЛЫХ?

Сямейная

КНІГІ ЯК ЛЕТАПІСЦЫ ГІСТОРЫІ

14

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КРУТОЙ, першы віцэ-прэм'ер:

«У сярэднетэрміновай перспектыве, на гарызонце 2025 года, мы павінны вырашыць маштабную задачу пабудовы IT-краіны. Павінны быць прадметныя, адчувальныя вынікі, якія мы можам паказаць не толькі нашаму грамадству, але і на міжнароднай арэне».

КОРАТКА

• Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў 2019 годзе перасягнуў $5,5 млрд.

• **Памёр народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, акадэмік Міжнароднай акадэміі тэатра рэжысёр Барыс Луцэнка. Спачуванне родным і блізкім накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**



• У Беларусі ў 2019 годзе быў перавыкананы план па будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай.

• **Студзень гэтага года быў самым цёплым у нашай краіне за ўсю гісторыю метэаназіранняў.**

• Электронны рэгістр выбаршчыкаў запрацуе са з'яўленнем біяметрычных пашпартоў.

• **У Мінску ў найбліжэйшы час не будуць укараняць новую ініцыятыву па кантролі аплаты праезду у наземным грамадскім транспарце — блакаваць валідатары і кампосцеры падчас руху.**

• У Беларусі сярэдняя зарплата будаўніка у 2019 годзе вырасла больш чым на 20 %.

ISSN 1990 - 763X

КНІЖНАЯ СТАЛІЦА СВЕТУ

У Мінску праходзіць XXVII Міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш «Беларусь — адкрытая кніга»

Выданні інтэрактыўныя, з малюнкамі, рэдкія, спецыяльныя — новенькія, яшчэ з самым цудоўным у свеце водарам друкарскай фарбы. Трапіць у «БелЭкспа» гэтымі днямі — усё роўна што кніжную шафу разбіраць. Там вока зачэпіцца за радок, тут старонку перагарнеш... Час ляціць, а адарвацца немагчыма. Ад такога багацця хочацца і вось тую прыгожасць з сабой знесці, і гэтую.

Што вочы разбягаюцца, не дзіўна, калі ўлічыць, што летась у Беларусі выдадзена амаль дзесяць тысяч назваў кніг і брашур агульным накладам 24 мільёны экзэмпляраў. Больш за восемсот кніг надрукавана на замежных мовах. Пра гэта паведаміў на ўрачыстым адкрыцці выстаўкі-кірмашу міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.

Па традыцыі прывітанне ўдзельнікам і гасцям выстаўкі даслаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «У нашай краіне стаўленне да кнігі заўсёды было асаблівае: беражлівае і паважлівае. Пытанні захавання і эфектыўнага развіцця выдавецкай галіны і сёння застаюцца ў ліку дзяржаўных прыярытэтаў. Упэўнены, што выстаўка і надалей будзе спрыяць прапагандзе якаснай літаратуры і культуры чытання, паслужыць умацаванню міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва», — гаворыцца ў лісце, які зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Вольга САЛАЎЁВА з дачкой Эміліяй былі аднымі з першых наведвальнікаў выстаўкі.

Кузня чэпіёнаў

Чарга ў ціры і трэнажоры пасля 22.00

Фізкультура і спорт у Старых Дарогах. Што ёсць і чаго не хапае гораду

У 2015-м тут з'явіўся новы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, на плошчы ўсяго 1,5 гектара размясцілася адразу і футбольнае поле, і тэнісны корт, і пляцоўка для пляжнага валейбола. Зімой, калі спрыяе надвор'е, усё гэта пераўтвараецца ў прастору для заняткаў лыжамі і канькамі. Кіруе цэнтрам былы прафесійны спартсмен, які пасля завяршэння гульнявой кар'еры не пабаяўся перабрацца са сталіцы ў раён з насельніцтвам у 19 тысяч, каб працягнуць займацца любімай справай.

СТАР. 15

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.